ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАН'ТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
Кошт асобнага № 3 кап.

№ 139 (1458) НЯДЗЕЛЯ, 16 ЖНІЎНЯ 1931 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Усе як адзін протэстуйце супроць крывавага тэрору польскага фашызму

Да ўсіх працоўных Савецкага Саюзу, да ўсіх працоўных БССР, да ўсіх мопраўцаў Савецкай Беларусі

З адозвы Цэнтральнага Камітэту МОПР'у БССР

Дарагія таварышы!

Весткі, якія дайшлі да працоўных мас СССР, за апошнія дні выклікалі вялікае абурэньне. Перад намі зноў факты фізычнага масавага зьнішчэньня рэволюцыйнага авангарду ў турмах Польшчы. 10000 палітзьняволеных гэроічна змагаюцца з польскім фашызмам супроць новага дэкрэту фашысцкага ўраду Пілсудзкага, па якому палітзьняволеныя прыраўніваюцца да ўмоў крымінальнікаў, і страшэнных, бесчалавечных катаваньняў палітзьняволеных ў турмах. Па ўсёй Польшчы, Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны пракацілася хваля масавых галадовак палітзьняволеных, як протэст супроць гэтых новых зьдзекаў.

Усё тое, што мы пачулі з газэт, з адозвы ЦК КПП, КПЗБ і КПЗУ, усё тое, што піша ў сваёй адозьве ЦК МОПР'у Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны аб новых жудасных зьверствах над палітзьняволенымі аб масавых забойствах і галадоўках, прымушае неадкладна мобілізавацца на дапамогу нашым братом—рэволюцыйным рабочым і сялянам, выканаць наш пролетарскі абавязак — солідарнасьць з палітзьняволенымі Польшчы. Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны шляхам магутнай хвалі протэстаў супроць разьюшанай крывавай оргіі польскага фашызму.

Толькі рашучы протэст усіх працоўных, ня толькі БССР але і ўсяго Савецкага Саюзу, ня толькі членаў МОПР'у БССР, але і ўсіх мопраўцаў Савецкага Саюзу, можа ўтрымаць крывавую расправу ката Пілсудзкага над абяззброенымі зьняволенымі. Да гэтага протэсту заклікае вас Цэнтральны камітэт МОПР'у БССР!

Протэстуйце шляхам масавых сходаў на заводах, фабрыках, у колгасах саўгасах, на палёх уборкі, ў чырвона армейскіх казармах, патрабуйце спыненьня крывай оргіі, расправ, катаваньняў і зьдзекаў над палітзьняволенымі рэволюцыйнымі рабочымі і сялянамі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Пасьпяховым правядзеньнем кампаніі протэсту і зборам сродкаў на дапамогу палітзьняволеным у гэты цяжкі час іх масавай галадоўкі, актыўным правядзеньнем кампаніі зімовай дапамогі і 100 проц. ўключэньнем у гэту кампанію ўсіх працоўных БССР, выкананьнем усіх пролетарскіх абавязкаў інтэрнацыянальнай солідарнасьцю ... будовай дзіцячых дамоў для дзяцей палітзьняволеных—адказам на новыя зьверствы, катаваньні і забойствы рэволюцыйных рабочых і сялян за ўсіх капіталістычных краінах і асабліва ў фашысцкай Польшчы.

Рабочыя і работніцы! Ведайце, што СССР зьяўляецца ўдарнай брыгадай міжнароднага пролетарыяту, што соцыялістычнае будаўніцтва СССР набліжае час сусьветнай пролетарскай рэволюцыі. Таму вы павінны выканаць ваш інтэрнацыянальны абавязак па форсаваньні тэмпаў працы, рашучай барацьбе за выкананьне плану году пяцігодкі, ліквідацыі прарываў і па-бальшавіцку падрыхтавацца да чатвертага году пяцігодкі, чатвертага перамогі ў чацьвертым годзе пяцігодкі.

Колгасьнікі, сельска-гаспадарчыя рабочыя і рабочыя МТС! Па-баявому мобілізуйцеся на пасьпяховае правядзеньне ўборкі ўраджаю 2-й бальшавіцкай вясны, здавайце ўсе лішкі ўраджаю збожжа, запаўняйце ссыпныя і загатоўчыя пункты збожжам, організуйце

масавыя чырвоныя абозы. Гэта будзе садзейнічаць пасьпяховаму правядзеньню соцыялістычнай пяцігодкі, гэта будзе лепшым адказам на фашысцкі крывавы тэрор Пілсудзкага і фашыстых усяго сьвету.

Рабоча-сялянская моладзь, комсамольцы і піонэры! ЦК МОПР'у БССР заклікае вас мобілізавацца разам з працоўнымі масамі Савецкай Беларусі на дапамогу палітзьняволеным. Усе, як адзін, протэстуйце супроць крывавага тэрору польскага фашызму, супроць падрыхтоўкі нападу на СССР. Выконвайце ваш пролетарскі абавязак перад палітзьняволенымі, уступайце ў рады МОПР'у. Будзьце застрэльшчыкамі ў справе дапамогі палітзьняволеным у гэты страшэнны час азьвярэлага польскага фашызму, а таксама ў кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным і пабудовы інтэрнацыянальных дзіцячых дамоў у СССР для дзяцей палітзьняволеных, забітых, расстраляных і пакалечаных рэволюцыянэраў.

Няхай жыве актыўная дапамога працоўных мас Савецкай Беларусі палітзьняволеным у іх барацьбе з польскім фашызмам!

Няхай жыве і мацнее міжнародная пролетарская солідарнасьць!

Прэч польскі фашызм, прэч катаў—забойцаў лепшых сыноў рэволюцыі!

Няхай жыве рэволюцыйная змаганьне рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі Польшчы, КПЗБ і КПЗУ!

ЦК МОПР БССР.

Два проценты месячнага заработку ў карысьць палітзьняволеных

Агульны сход рабочых і служачых фабрыкі „Усход" (Менск), у адказ на разгул крывага тэрору, нечалавечыя катаваньні палітзьняволеных у турмах фашысцкае Польшчы, выказвае свой рашучы протэст.

Сход ухваляе пацлічыць 2 проц. месячнага заработку ў карысьць палітзьняволеных і іх сем'яў, абвясьціць дэкаднік МОПР'у па 100 проц. уцягненьню рабочых у яго рады, узмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне, асабліва сярод новых рабочых фабрыкі.

Сход просіць МОПР Беларусі прымацаваць да фабрыкі адну з замежных мопраўскіх організацый.

Усе рабочыя і служачыя—ў рады МОПР'у

Рабочыя, тэхнічны пэрсонал і служачыя заводу „Полымя рэволюцыі" ў адказ на шалёныя зьдзекі польскіх фашыстых над палітзьняволенымі, уносяць адзін процант месячнага заработку на карысьць палітзьняволеных і іх сем'яў. Усе рабочыя і служачыя заводу ўступаюць у рады МОПР'у.

Узмоцнім сувязь з замежнымі таварышамі

Заслухаўшы адозву ЦК МОПР'у Польшчы і Заходняй Беларусі аб зьдзеках у польскіх турмах над палітзьняволенымі, мітынг рабочых і служачых швэйнай фабрыкі „Кастрычнік" (Менск) пастанавіў узмацніць на фабрыцы працу МОПР'у, перавыканаць заданьне па зімовай дапамозе палітзьняволеным, узмацніць сувязь з рабочымі Віленскай швэйнай фабрыкі.

Шэф усеабучу трымае экзамен

Партыя вызначыла перад нашай краінай задачу пераправіць Савецкую Беларусь да 1-га мая 1932 году ў краіну суцэльнай пісьменнасьці. Выкананьне гэтай грандыёзнай задачы патрабуе неадкладнай мобілізацыі ўвагі усёй пролетарскай грамадзкасьці і ў першую чаргу комсамолу,—шэфа ўсеабучу.

Сваечасовы пачатак навучальнага году трэцяга, рашаючага павінен забясьпечыць далейшае пасьпяховае разгортваньне культурнай рэволюцыі, выкананьне задач пастаўленых нашай партыяй аб далейшым разгортваньні ўсеабучу.

1-га верасьня наша краіна павінна пачаць навучальны год.

Аднак, стан падрыхтоўчай работы ўнушае трывогу навучальнаму. Яшчэ нямя бальшавіцкіх тэмпаў у гэтай падрыхтоўчай рабоце. Комсамольскія організацыі ў шэрагу месц опортуністычна недаацэньваюць задачы ўсеабучу, задачы падрыхтоўкі.

Поўнае выкананьне плянаў школьнага будаўніцтва і рамонту школ, сваечасовае забесьпячэньне школ падручнікамі, вопраткай, абуткам, гарачым сьнеданьнем, апаратам, выкананьне разьвёрсткі ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў у пэдтэхнікумы, падрыхтоўка да ўпартага ажыцьцяўленьня палітэхнізацыі школы—вось задачы, якія патрабуюць самай неадкладнай рэалізацыі, і рэалізацыя якіх павінна забясьпечыць посьпех навучальнаму.

1-га верасьня пераводзе пастанову ЦК КП(б) ЦК ЛКСМБ праводзіцца усебеларускі „дзень школы". Гэтае зьліваньне палітычнай важнасьці мерапрыемства павінна зьявіцца магутным вагаром мобілізацыі партыйных, комсамольскіх, профсаюзных організацый і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці на справу выкананьня баявых задач культурнай рэволюцыі, вызначаных апошнімі пастановамі ЦК КП(б)Б. Падрыхтоўчая работа да яна школы павінна быць распачата зараз-жа.

ЦК ЛКСМБ пастанавіў, каб кожная ячэйка сёньня, абавязкова комсамольская Беларусі, па-баявому падрыхтавацца да „Дня школы", правесьці ўсебеларускі суботнік па забесьпячэньню школ апаламі, па выкананьню плянаў школьнага будаўніцтва. Гэты суботнік павінен быць праведзен з посьпехам.

Пасьпяховае правядзеньне гэтых мерапрыемстваў павінна забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне навучальнага году. Комсамолія—шэф усеагульнага навучаньня выкананьнем гэтых мерапрыемстваў, выкананьнем баявых задач партыі трымае перад партыяй і ўсёй краінай новы, баявы экзамен.

Гэты экзамен на здольнасьць па-бальшавіцку ажыцьцяўляць задачы культурнай рэволюцыі павінен быць з гонарам вытрыманы кожным комсамольскім камітэтам, кожнай ячэйкай.

17-га жніўня, а сёмай гадзіне ўвечары, у памяшканьні ЦК ЛКСМБ скліканецца пашыраная нарада цэнтральнай мюдаўскай камісіі сумесна з мюдаўскай камісіяй Менгаркому ЛКСМБ і прадстаўнікамі профактыву.

На нарадзе будуць заслуханы даклады:
1. Аб падрыхтоўцы да МЮД'у Менскага, Віцебскага, Гомельскага гаркомаў; Койданаўскага і Чэрвеньскага райкомаў ЛКСМБ.
2. Даклад ЦСПСБ аб становішчы культурна-бытавой работы сярод рабочае моладзі.

На нараду выклікаюцца:
Мюдаўская камісія Менгаркому, сакратары колектываў „Варашылава", „Комунара", „Кастрычніка" і Белдзяржбуду, т. Плешакоў (ЦСПСБ), прадстаўнікі ЦП саюзаў, прадстаўнікі заўкомаў „Варашылава", „Комунара", „Кастрычніка" і Белдзяржбуду, прадстаўнікі культпропу ЦК КП(б)Б, т. т. Дуброўскі (БДВ), Ржэўцкі (гіст. парт.) Анісаў („ЧЗ"), Дубравіцкі („Юнгэр Арбэйтэр"), Галоткін (радыё газэта), Курганаў (Белдзяржкіно), Кучар (Бел-АПП), Стэльмах (ТРАМ).

Старшыня Цэнтральнай мюдаўскай камісіі ПЭРЛІНА.

Ліст з Зах. Беларусі

Шукаючы выхаду з глыбокага эканомічнага крызісу, польскі фашызм узмацняе наступ на рабочую клясу і працоўныя масы сялянства. З вялізарнешай сілай гэты наступ адбіваецца і на становішчы рабочай і працоўнай моладзі. Побач з эканомічным рабаваньнем моладзі праводзіцца і ... ўзмоцнена ... моладзі на яе фашызацыю ... Гэта дзеяля таго, каб стрымліваць ... каб выхоўваць яе ў духу патрыятызму і гэтым ... ў радох моладзі ... ўзмоцнена ... фашыстамі. Імянна гэтаму служыць ліквідацыя ... арганізацый моладзі ... і ... фашысцкіх ...

На вёсках ... Захадняй Беларусі ствараны такія ... організацыі, як „Стовадзь ... ўзяць ... „Стралец", ... у які фашызм ... сялянскую моладзь ... ваенізацыю. Узмацняецца ... ўсякім ... арганізацыі праводзіцца ... Хто адмаўляецца ... праследуецца ...

Але-ж, ня гледзячы на такую энэргічную дзейнасьць фашыстых на сталае распаўсюджаньне ... з кожным днём ... гэтага эканомічнага крызісу ... моладзь выяўляе ... іх узмацнянага бражаньне ... вялізарных ... элемэнтаў, якія ... „барометрам" ... для ... партыі ... рэволюцыі, ... „ЛОПП" і ... ідзе ... і вёсных ... ну ... сацыяльнай рэволюцыі, ... з кожным ... гадам ... фашызму ... Усё больш ... ідзе ... з гэтых ...

Рэжыме рабункаў голаду і сьмерці

(аб становішчы працоўнае моладзі)

Зпаглыбленьнем эконамічнага крызісу ўзмацняецца наступ фашызму на матар'яльнае становішча рабочых, моладзі і жанчын. Гэты наступ набывае ўсё больш нябывалыя памеры. Ён выяўляецца ў скарачэньні да мінімуму зарплаты, у масавым звальненьні рабочых з прадпрыемстваў, у асуджэньні на галодную сьмерць дзесяткаў тысяч, пазбаўленых усякіх магчымасьцяй існаваньня.

Зарплата рабочых у апошні час страшэнна зьнізілася і гэта больш за ўсё адбіваецца на моладзі. Малады рабочы ў дзень атрымлівае ня больш 50 гр.—1 злоты (1 злоты раўняецца 22 кап.) Часта і гэта арплата зьніжаецца да паловы. Прыклады мы маем на шкляной гуце ў Вільні, дзе маладым рабочым за два тыдні катаржнай працы заплацілі толькі 2 злотых. Аб восьмігадзінным рабочым дні і гутаркі быць ня можа. Моладзь і жанчыны працуюць па 10-12 гадзін і болей.

Такое нявыноснае становішча рабочае моладзі спадарожваецца вялікім ростам у яе гушчах абурэньня на заводчыкаў - фабрыкантаў. на ўвесь існуючы лад. Але-ж гэта абурэньне сустракае сьцяну рэпрэсій і прасьледаваньняў. За малейшае рэволюцыйнае выступленьне, за кожнае слова супроць гаспадара рабочы звальняецца з працы і перадаецца ў рукі паліцыі, якая з ім жорстка распраўляецца.

Нявыносна становішча моладзі і на вёсцы. Аграрная палітыка польскага фашызму накіравана на ўзмацненьне абшарнікаў і кулацтва за кошт яшчэ большага абрабаваньня працоўных мас сялянства.

Працоўны селянін з сваёй невялікай дзі пры тым яшчэ неўраджайнай палоскі, пазбаўлен магчымасьці пракарміць сябе і сваю сям'ю. Ён прымушан пасылаць сваю жонку і дзяцей да абшарніка, да кулака, а гэтыя павукі дзіка эксплёатуюць іх, прымушаюць працаваць ад цёмнага да цёмнага за нікчэмную плату.

Напрыклад, абшарнік Міхайлоўскі. Слонімскага павету, Ніжавіцкай гміны, наймаючы на летні сэзон сялянскую моладзь і жанчын, плаціць ім за 17-гадзінны рабочы дзень толькі 1 злоты. Ды і гэтую зарплату прыходзіцца атрымліваць з вялікімі цяжкасьцямі. Падлеткам ад 10 да 15 год плаціць ня больш 50 грошай. У цагельні гэтага-ж абшарніка, дзе пераважна працуе моладзь і жанчыны, зарплата за такі-ж самы рабочы дзень не перавышае аднаго злотага.

Абшарнік Лільпапа, Казлоўскай воласьці, Слонімскага павету ня толькі па зьверску эксплёатуе рабочую моладзь і батракоў, але-ж у дадатак да гэтага ўчыняе страшэнныя зьдзекі. Калі адзін малады рабочы пачаў супраціўляцца такому рэжыму, Лільпапа выстраліў у яго з ружжа і цяжка параніў. Гэты-ж абшарнік для сваёй „пацехі" загадваў рабочым паміж сябою біцца' зьдзекавацца адзін на другім.

Абшарнік Гэрубовіч, які жыве недалёка ад Лільпапа. таксама мала адышоў ад апошняга. Дзікая эксплёатацыя батракоў і наёмных рабочых за нікчэмную плату, біцьцё і зьдзекі „пацеха" абшарніка. Гэты Гэрубовіч моцна зьбіў батрака—Белавуса, а пасьля пасадзіў яго на цэлы дзень ў прыбіральню.

Такое нявыноснае становішча і зьдзекі выклікаюць сярод рабочае клясы і працоўнага сялянства ўсё большае рэволюцыянізаваньне і рэволюцыйныя выступленьні. Барыкадныя баі рабочых з паліцыяй у горадзе, масавыя напады кулацкіх і абшарніцкіх маёнткаў, а ў апошні час і ўзброеныя выступленьні працоўнага сялянства сьведчаць аб тым, што меч помсты супроць крывавай дыктатуры фашызму падымаецца ўсё вышэй і вышэй.

У адказ на рост рэволюцыйнага руху ў Польшчы і Заходняй Беларусі ўсё больш нагле фашысцкая дыктатура. Будуюцца астрогі, біткам запаўняюцца яны рэволюцыйнымі рабочымі і сялянамі, дзе ўтвараюцца жудасныя зьдзекі, дзе ўводзіцца рэжым фізычнага зьнішчэньня.

Сярод рабочых і сялян праводзяцца масавыя арышты. Нядаўна ў Слонімскім павеце адбыліся арышты сярод сялянскае моладзі. Арыштаваным прад'явілі абвінавачаньне ў прыналежнасьці да комсамолу. У Слонімскай дэфэнзыве катавалі іх два тыдні. Арыштаванаму Мозалю А. улілі праз нос 8 бутэлек вады, зьбілі пяткі і той доўга ня мог хадзіць. Арыштаванага Лябецкага зьбілі да страты прытомнасьці, тое самае было і з Альшэўскім і з іншымі арыштаванымі.

Пасьля такога катаваньня арыштаваных пасадзілі ... сама паўтарылі і ... га кінулі на тр... Коску так зьб... ішла з носу ... Калі арыштрываў ... чаму, ... усіх іх ... біў. ... ўсьця... няй ... ня ... вёск... арыш... туры ... ваньн... Але ... цоўны... партыі фашыс... з яго ... шыстым... лу расту... біраюць ...

Да 17 МЮДу

...ўзы ... ЛКСМБ, ...сячнік па ліквідацыі ... на жывёлагадоўчай ... фронце, які праводзіцца з 15 жніўня.

Мобілізаваны комсамольцы, ...сьнікі ... на рашучае ...выцзаўленьне адозвы ЦК КП(б) і СНК СССР аб соцыялістычнай жывёлагадоўлі. З 15 па 25 жніўня ... праводзіцца дэкаднік ... ...ваньне сілосных ям ... ...дкі сілосу, каб забясьпечыць жывёлагадоўлю кармавой базай.

Сакратар РК ЛКСМ ФУКСОН

Паведамленьне

Сёньня, 16-VIII—31 г., а 6-й гадзіне увеч., у памяшканьні ГК ЛКСМБ скліканецца шырокая нарада нач. груп „ЛК" г. Менску і актыву ячэек ЛКСМБ МДРК і БКС па пытаньню дэкадніка збору тары да МДРК.

Менгарком ЛКСМБ.

Адкрывайце дзьверы навучальнаму!

Выходзьце на ўсебеларускі суботнік дапамогі школе

Да пачатку навучальнага засталося **15** ДЗЁН

ПАСТАНОВА

сакратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 14-га жніўня 1931 г. аб удзеле ЛКСМБ ў правядзеньні „Дня вучобы" 1-га верасьня.

1. Прапанаваць усім ГК і РК зараз-жа ўключыцца ў падрыхтоўку і правядзеньня „Дня вучобы" 1-га верасьня. Уся падрыхтоўчая работа да гэтага дня павінна прайсьці пад знакам мабілізацыі ўсіх комсамольцаў і працоўнай моладзі на пасьпяховае правядзеньне падрыхтоўкі да новага навучальнага году і ліквідацыю тых прарываў, якія маюцца на гэтым вучастку.

2. Лічыць, што комсамольскія організацыі да гэтага дня павінны прысьці з пэўнымі паказчыкамі, характарызуючымі барацьбу комсамолу за ўсеабуч, у прыватнасьці:

а) Поўнае выкананьне пляну школьнага будаўніцтва і рамонт школ.

б) Своечасовае забесьпячэньне школ вопраткай, абуткам, гарачымі сьнеданьнямі, апалам, вучэбнымі прыладамі.

в) Выкананьне разьвёрсткі мобілізацыі ў лік 1000 у пэдустановы.

Уся гэта работа павінна быць увязана з працай па падрыхтоўцы да МЮД'а.

3. Падтрымліваючы ініцыятыву Сураскага РК КСМ, лічыць неабходным у „Дзень вучобы" правядзеньне комсамольскага ўсебеларускага суботніку па забесьпячэньню школ апалам. У гэты-ж дзень організаваць дэмонстрацыю школьнікаў з удзелам рабочых, колгасьнікаў, комсамольцаў, вечары, выстаўкі, ілюструючыя працу ў кожнай організацыі па правядзеньню падрыхтоўкі да навучальнага году.

4. „Чырвоная Зьмена", „Юнгэр Арбэтэр" разгарнуць належную работу па асьвятленьню хода падрыхтоўкі да правядзеньня „Дня вучобы".

Пошта-тэлеграма ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене"

Сураская райорганізацыя ЛКСМБ у парадку падрыхтоўкі да 17 МЮД'у організуе раённы комсамольскі суботнік у дапамогу школе.

Організуемы суботнік мы праводзім пад лёзунгамі „за своечасовае сканчэньне рамонту школ", „дамо дзетвары цёплую школу". Да ўдзелу ў суботніку ўцягваем усю грамадзкасьць, колгасьнікаў, беднякоў, серадьнякоў, аднаасобнікаў. Пры РК складзена операцыйная тройка, райактыў размеркаваны па сельсаветах для організацыі падрыхтоўкі і непасрэднага правядзеньня суботніку.

Мы ўносім прапанову ператварыць наш пачын ва ўсебеларускі комсамольскі суботнік па падрыхтоўцы да навучальнага году, прызначыўшы яго правядзеньне 1-га верасьня, у „Дзень вучобы".

Сэкратар Сураскага РК ЛКСМБ Гольдман.

Сустрэнем ва ўсеўзброеньні

У Вобальшчыне (Сіроцінскі раён) распачалася баявая падрыхтоўчая работа да навучальнага году.

Абгаварыўшы на сходзе пытаньні і бальшавіцкай сустрэчы навучальнага, комсамольцы разам з актывам сельсавету разышліся па вёсках, дзе і зрабілі перапіс усіх няпісьменных.

Брыгадзір „Ч. З."—Шэдзька.

„Чырвоназьменаўскі" пост данosіць

ЗВОДКА АБ СТАНЕ ПАДРУЧНІКАЎ

Аўтар	Назва кнігі	Дзе знаходзіцца
Кавaевіч, Хайтун	Грамадазнаўства для вячэрніх школ	У стыльрэдакц. з 3-VIII
„	Грамадазнаўства III групы	„ „ з 11-VIII
Сталін	Пытаньні ленінізму	У карэктуры з 8-VIII
Бурдзенскі	Асновы рацыяналіз. вытворч.	„ „ з 10-VIII
Альховік	Азбука ленінізму	У БДВ з 15-VII
Моклюк і інш.	Акцябраты (кн. для I гр. ФЗС)	У тэхрэдакцыі
Касабуцкі і інш.	Раб. кніга па матэматыцы	„ „ з 31-VII
Ярасляўскі	Гісторыя УсеКП(б)	На перакладзе з 10-VII
Хануцін і інш.	Гісторыя клясавай барацьбы I ч.	„ „ з 28-V

Кіраўніцтва БДВ павінна неадкладна прыцягнуць да адказнасьці тых, хто зрывае выданьне падручнікаў.

Пост „Чырвонай Зьмены" пры БДВ.

Барацьба з рэлігіяй— барацьба за соцыялізм

ВЫКАНАЦЬ НАКАЗЫ

„Патрабуем перадачы касьцёлу па Савецкай вул. на культурныя патрэбы працоўных Менску"

Памяшканьне касьцёлу—пад культурную ўстанову

Уявіўшы сабе ўсю шкоднасьць рэлігіі, як контр-революцыйнай сутнасьць, агульны сход паравозных брыгад і дэпо Менск МББ чыгункі патрабуе перадаць дамы рэлігійных культаў, пабудаваныя за працоўныя сродкі, на культурныя патрэбы гэтых працоўных. У прыватнасьці патрабуем перадачы касьцёлу па Савецкай вуліцы на культурныя патрэбы працоўных гор. Менску.

Сход патрабуе безадкладна выканаць тэту пастанову і рэалізаваць пастановы рабочых і працоўных насельніцтва гораду Менску, прынятыя год таму назад.

Выклікаем іншыя прадпрыемствы на збор подпісаў для скасаваньня касьцёлу.

Няхай жыве культурная рэволюцыя!

Сьмерць капіталу і яго зброі— рэлігійнай цемры!

Прэзыдыум агульнага сходу.

Памяшканьне касьцёлу— працоўным

Пасьпяховае наступленьне соцыялізму па ўсім фронце на рэштві капіталістычных элемэнтаў як у горадзе, так і на вёсцы, пасьпяховае ажыцьцяўленьне лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі,—усё гэта не магло не абвастрыць барацьбы ўсіх ажываючых капіталістычных клясаў супроць дыктатуры пролетарыяту, супроць генеральнай лініі комуністычнай партыі.

Мы, рабочыя-лазні службы эксплёатацыі чыгункі ст. Менск, патрабуем ад менгарсавету неадкладна зачыніць вовы касьцёл на Савецкай вуліцы і перадаць яго працоўным для культурных патрэб.

Адначасова мы патрабуем ад Гарсавету хутчэй выканаць наказы рабочых ў часе выбараў у Гарсавет аб перадачы дамоў рэлігійнага культу пад культпатрэбы працоўных Менску.

Барацьба з рэлігіяй—ёсьць барацьба за соцыялізм!

Прэзыдыум агульнага сходу.

ПА ДРЫСЕНЦАХ НЕ РАЎНЯЦЦА!

Да пачатку новага навучальнага году засталіся лічаныя дні. ЦК КП(б)Б у сваей апошняй пастанове па пытаньню падрыхтоўкі да новага навучальнага году з усёй бальшавіцкай рашучасьцю прапанавае райорганізацыям узмацніць тэмпы падрыхтоўкі да новага навучальнага. Гэта пастанова не зрабіла патрэбнага пералому ў падрыхтоўцы па Дрысенскаму раёну. Раён і новаму году не рыхтуецца.

У раёне зараз налічваецца 67 школ першай ступені і 15 школ другой ступені. Апроч гэтага паводле пляну маркуецца адкрыць яшчэ 13 школ першага концэнтру і 17 школ другога концэнтру. У гэтым годзе на нашых вобласьцях адкрыта школ... усе дзеці школьнага ўзросту Дрысенскага р-ну. Таму ў раёне павінна быць шырока разгорнута будаўніцтва новых школ з тым, каб да пачатку навучальнага 18 школ скончыць будаўніцтвам. Між тым, на сёньні дзень пабудавана ўсяго 3 школы. Па думцы інспэктара Нарасьветы т. Кавалёва к пачатку году будзе пабудавана яшчэ адна школа. Будаўніцтва каля 10 школ толькі распачалі. Заклалі падмурак, але далей праца не пайшла, ня гледзячы на тое, што школы поўнасьцю забясьпечаны будаўнічымі матар'яламі. Будаўніцтва школ зусім не распачата ў Дзернавіцкім, Сар'янскім. Бігосаўскім сельсаветах.

РВК мала ўдзяляў увагі будаўніцтву школ. За ўвесь час РВК не заслухаў ні разу інфармацыі аб ходзе апошніх і ня даў належных указаньняў с-с у гэтай працы.

Дрэнна абстаіць справа з забясьпячэньнем школ II ступені выкладчыкамі. Зараз не хапае 11 выкладчыкаў. Інспэктарыят Нарасьветы не клапоціцца аб забесьпячэньні школ выкладчыкамі. Інспэктарыят на сёньнішні дзень ня ведае, як вучні школ забясьпечаны падручнікамі. „Мы заявкі далі, а як справа з выкананьнем, я ня ведаю"— гаворыць інспэктар Нарасьветы т. Кавалёў.

Катастрафічнае становішча і з забесьпячэньнем школьнікаў адзеньнем і абуткам. Заяўкі, пададзеныя інспэктарыятам нарасьветы кустпрому і іншым організацыям, не выконваецца.

Дрысенская абутковая арцель тармозіць пачынку дзіцячага абутку мінулага году. Абутак ляжыць больш двух месяцаў, а да пачынкі ня прыступілі.

Ня лепш справа і з політэхнізацыяй. Патрэбныя прылады не набыты. Да прамацаваньня школ да прадпрыемства, МТС, колгасам і саўгасам і заключэньне з імі дагавору ня прыступілі. Раён ня ўключыўся ва ўсебеларускае спаборніцтва па культурнаму будаўніцтву. Райорганізацыі не змагаюцца за пераходны сьцяг ЦК КП(б)Б. Зусім ня прымае ўдзелу ў падрыхтоўцы да новага навучальнага году Райспажыўсаюз. Заяўк. атры аныя ад інспэктарыяту нарасьветы на забясьпячэньне вучняў харчаваньнем, Райспажыўсаюз нават не разглядаў.

Пагражаючае становішча з забясьпячэньнем школ абсталяваньнем. Сталярная арцель Дрыса не ўзяла ба-шавіцкіх тэмпаў ў вырабе школьнага абсталяваньня. Заяўкі выканаьы толькі на 30 проц.

Партыйна-комсамольскія організацыі не ўдзяляюць увагі важнейшаму вучастку работы—барацьбе за ўсеагульнае навучаньне, за пасьпяховае сканчэньне будаўніцтва школ.

РК КП(б)Б ня выканаў пастановы ЦК КП(б)Б у якой гаворыцца: „Раённым камітэтам КП(б)Б мобілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, а таксама ўвагу і сродкі грамадзкасьці вакол школьнага будаўніцтва".

Часу да пачатку навучальнага году засталося мала. Райорганізацыі павінны неадкладна ўзяць бальшавіцкія тэмпы ў падрыхтоўцы да новага навучальнага.

Зрыўшчыкі школьнага будаўніцтва павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Выязная рэдакцыя „Ч. З." Казлоў, Канончык.

Брыгада Юнкораў „Ч. З." Абрамсон, Мікуцкая, Рабічова, Забо с і, Ушацкі, Петрашэнка.

Міх. Варнікоўскі.

Напярэдадні рашаючых перамог

да 1-га ўсесаюзнага зьезду польскіх пролетарскіх пісьменьнікаў

Заўтра ў Менску пачынае работу першы ўсесаюзны зьезд польскіх пролетарскіх пісьменьнікаў. У дні разьюшанага фашысцкага тэрору, нябачанага абвастрэньня экономічнага крызісу ў Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, у дні разгорнутага соцыялістычнага наступу па ўсяму фронту, у дні гістарычнай кладкі фундаманту соцыялістычнай экономікі, росквіту культуры,—нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу ў СССР— зьбіраецца гэты вялізарнейшай літаратурна-політычнай важнасьці зьезд.

Толькі дзякуючы братэрскаму ... працоўных мас усіх на актывізу... зьдаваных у якасьцю ўдзел ... нацыянальна-культу... ючы ажыцьцяў... У апошні час атрым нацыянальнай барацьбе за шматмільёна вялізар... Тысячы перадавых прол... ыты намі дых працоўных прышлі у ... істычнага самолу. Дзесяткі агрэгат, ... заводаў акомсамолены.

Цяпер комсамолія Менску ... дзейсна рыхтуецца да ХУІІ М... нага Юнацкага Дня, ... рост ...

Вялікая ўвага у гэтай падр... сочай рабоце да МЮД'у аддаец... ўдар... таньням узмацненьня барацьб... лектываў і ячэек за ... ажыцьцяўленьне ленінскай не... за культуру—нацыянальную ... ме і пролетарскую па зьмес... рабочых ...

Мы маем цэлы рад пер... політычкай комсамолії ў ажыць... літурныя шэфства над усеабучам, б... працоўполітэхнізацыю разгортван... скага руху і г. д.

...ам. перало... му ў соцыялістычнай рэконструкцыі польскай вёскі. Увесну 1932 г. будзе скончана суцэльная колектывізацыя польскай вёскі СССР. Гэтыя зрухі зьяўляюцца моцным стымулам пасьпяховага разьвіцьця польскай пролетарскай літаратуры.

Барацьба за пяцігодку ў чатыры гады, барацьба за далейшае пасьпяховае ажыцьцяўленьне ленінскай нацполітыкі партыі вызначаюць перад польскім пролетарскім літаратурным рухам вялізарныя задачы.

Польская пролетарская літаратура заклікана мобілізоўваць польскія масы працоўных гораду і вёскі на барацьбу за выкананьне пляну трэцяга, рашаючага году пяцігодкі,—году завяршэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі. Польская пролетарская літаратура павінна зьявіцца актыўным удзельнікам разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва. Яна павінна змагацца за выкананьне лёзунгу аб скончэньні колектывізацыі польскай вёскі да вясны 1932 году.

Далейшае пасьпяховае разьвіцьцё польскай пролетарскай літаратуры ў СССР залежыць ад сьціслага братэрскага супрацоўніцтва яе з пролетарскім літаратурным рухам працоўных мас іншых нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу.

Падрыхтоўчая паласа да зьезду характэрна значным ажыўленьнем, значным разгортваньнем польскага пролетарскага літаратурнага руху, уцягненьнем у яго новых колаў польскіх рабочых і працоўных.

Пытаньні барацьбы за пролетарскія кадры, за ідэолёгічны творчы рост, пытаньні організацыйнага замацаваньня закліку ўдарнікаў у літаратуру—гэта пытаньні, вырашэньню якіх зьезд польскіх пролетарскіх пісьменьнікаў павінен аддаць максымум увагі.

Польская пролетарская літаратура—маладая літаратура. У дні рашаючага году пяцігодкі разгортваецца нябачаная раней рашучая барацьба за бальшавіцкую, дзейсную, пролетарскую літаратуру. Гэтая акалічнасьць патрабуе ад літаратурных організацый (РАПП, БелАПП і г. д.), ад комсамолії і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці актыўнай братэрскай дапамогі польскім працоўным масам у іх барацьбе за сваю, нацыянальную па форме і пролетарскую па зьместу, літаратуру.

Зьезд павінен зьявіцца магутным вагаром у вырашэньня гэтае задачы, у абкружэньні польскай літаратуры пільнай увагай, актыўнай дапамогай.

Трэба сказаць, што польская пролетарская літаратура ўжо мае прыклады актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. Аднак, тэмпы яе разьвіцьця яшчэ адстаюць ад тэмпаў выкананьня сучасных гаспадарча-політычных задач краіны, адстаюць ад тэмпаў агульнага культурнага разьвіцьця польскіх працоўных мас.

Польская літаратура яшчэ ня мае твораў аб польскім рабочым-ударніку. У той-жа час тэматыка нашых маладых літаратурных кадраў ужо цяпер ня ведае ідэолізацыі шляхецка-кулацкага польскага хутару. Гэтая тэматыка адыходзіць у мінулае, гэтая тэматыка сьціраецца пераможным разгортваньнем соцыялістычнага будаўніцтва.

Такія агульныя рысы разьвіцьця польскай літаратуры сьведчаць аб тым, што ня гледзячы на значныя заваёвы, перад польскім пролетарскім літаратурным рухам наша эпоха ставіць цэлы рад грандыёзных задач. У барацьбе за вырашэньне гэтых задач трэба рашуча змагацца супроць усялякіх праяў ідэолёгіі варожых марксызму-ленінізму, супроць нацыянал-опортунізму, вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі і шовінізмаў іншых колераў.

Нельга не адзначыць пра ліст польскай сэкцыі ўкраінскага згуртаваньня комсамольскіх пісьменьнікаў „Маладняк" („Трыбуна радзецка" № 88, ад 9-га жніўня), які вымагае стварэньня адмысловай польскай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў. Зусім зразумела, што такія патрабаваньні нічога агульнага ня маюць з ленінскімі прынцыпамі нацполітыкі партыі, што яны адрываюць польскую літаратуру ад пролетарскіх літаратур братэрскіх нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу. Пасьпяховае вырашэньне задач, стаячых перад польскай пролетарскай літаратурай у значнай меры залежыць менавіта ад актыўнага супрацоўніцтва з пролетарскімі літаратурамі іншых нацыянальнасьцяй СССР. Толькі на гэтым грунце дасягнуты сёньняшнія перамогі польскай пролетлітаратуры.

Усесаюзны зьезд польскіх пролетарскіх пісьменьнікаў павінен вырашыць цэлы рад задач далейшага разьвіцьця польскай пролетарскай літаратуры і разам з тым продэманстраваць перад пролетарамі і працоўнымі масамі Савецкага Саюзу, фашысцкай Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны новыя перамогі, здабытыя дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай політыкі партыі ў нашай краіне.

Друкарня імя

Штурм ... — За своечасовы пуск падшэфных 45

Адчыняем прадмюдаўскую завочную кантрольную нараду комсам. організацый раёнаў будаўніцтва ільназаводаў

Ленінскі комсамол Беларусі зьяўляецца шэфам будаўніцтва 45 ільнаапрацоўчых заводаў, якія павінны да пачатку 1932 году ўступіць у рады нашай соцыялістычнай прамысловасьці. 5 ільназаводаў Чырвонапольскі, Вушацкі, Крупскі, Межанскі, Копыскі па пляну павінны быць пушчаны да 20-га верасьня: 6 заводаў павінны быць пушчаны да 1-га кастрычніка; 7—да першага лістапада, астатнія 14—да 1-га сьнежня і 13 заводаў асобных ільнаводчых раёнаў—да 1-га студзеня.

Аднак, выкананьне пляну будаўніцтва большасьці ільнаапрацоўчых заводаў унушае сур'ёзную трывогу, пагражае своечасоваму пуску. Вось прыкладна, заводы, якія павінны быць пушчаны да 20-га верасьня. На 10-ае жніўня выканалі плян па будаўніцтву: Межанскі—на 55 проц. галоўны корпус, на 46 проц. астатнія будынкі; Копыскі—55 проц. галоўны корпус, 49 проц. астатнія будынкі; Вушацкі—57 проц. галоўны корпус, 39 проц. астатнія будынкі.

Такое ганебнае адставаньне ў выкананьні будаўнічых плянаў ільнаапрацоўчых заводаў атрымалася толькі таму, што комсамольскія організацыі свае абавязкі шэфа не выконваюць, не ўзялі пад асабісты нагляд будаўніцтва, не ўключыліся па-баявому ў штурм за своечасовы пуск гэтых прадпрыемстваў. Хіба нормальна такое становішча, што і да гэтага часу, прыкладна, на Сурaскім заводзе, няма навет комсамольскай ячэйкі.

Комсамольская організацыя павінна зараз-жа дабіцца ліквідацыі гэтага ганебнага адставаньня.

У напрамку разгортваньня шырокай падрыхтоўкі да XVII МЮД'у комсамольскія організацыі ільназаводаў ільнаводчых раёнаў павінны па-баявому ўлючыцца ў штурм, які вядзе шматмільённы комсамол за своечасовы пуск новых заводаў, за пасьпяховае выкананьне задач трэцяга, рашаючага году, за паскоранае тэмпаў будаўніцтва соцыялізму.

Прысьвечваючы гэтаму прадмюдаўскую завочную кантрольную нараду комсамольскіх організацый новых ільназаводаў лічым адчыненай.

Удзельнікамі завочнай кантрольнай нарады зьяўляюцца ўсе організацыі новых ільнаапрацоўчых заводаў ільнаводчых раёнаў.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" будзе на чарзе прадстаўляць удзельнікам слова ў спрэчках. Выступаючы ў спрэчках на завочнай нарадзе, комсамольскія організацыі гэтых прадпрыемстваў і раёнаў павінны расказаць партыі, усяму ленінскаму комсамолу, усёй пролетарскай грамадзкасьці, як яны практычна выконваюць абавязкі шэфа, як змагаюцца за бальшавіцкія тэмпы ў будаўніцтве, як разгорнута соцспаборніцтва, ударніцтва, што зроблена па рэалізацыі гістарычнай прамовы тав. Сталіна, чым і як дапамагаюць ім ячэйкі ільнаводчых саўгасаў і калгасаў.

Слова ў спрэчках— комсамоліі Боркавіцкага ільнасаўгасу

„Пакажэце як комсамол можа па-ўдарнаму працаваць і забясьпечыць перамогу"

Наш ільна-саўгас у гэтым годзе сабраў ураджай 1114 га лёну, які непасрэдна паступіць на ільназавод, які будуецца ў Боркавічах.

800 тон ільнатрасты, прызначанай для Боркавіцкага ільназаводу, з маўчальнага маўчаньня ... ляжыць неапрацаванай. Чакаючы калі скончыцца будаўніцтва ільназаводу. А тэрмін — к 1-му студзеня 1931 году—крайшоў.

Чарапашыя тэмпы будаўніцтва Боркавіцкага ільназаводу. зрываюць хутчэйшы пуск яго ў эксплёатацыю.

Вялікая зацяжка будаўніцтва ільназаводу пагражае зрыву першапачатковай апрацоўкі нашай сыравіны і не дае магчымасьці скарыстаць 800 тон гатовай ільнатрасты, якую мы ўжо маем. А гэта—мільёны рублёў страты для дзяржавы і зрыву намечаных плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Комсамольская організацыя ільнасаўгасу зьвяртаецца да ўсёй Дрысенскай комсамоліі—шэфа будаўніцтва з заклікам дапамагчы заводу хутчэй уступіць у эксплёатацыю ўступіць у магутныя колёны „518". Гэта магчыма пры ўмове шырокага разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва на будаўніцтве, сапраўднага ўкараненьня зьдзельшчыны, павышэньне тэмпаў працы і якасьці, праз палепшаньне грамадзкага харчаваньня рабочых будаўніцтва, культурнага іх абслугоўваньня, праз забясьпечаньне будаўніцтва Боркавіцкага ільназаводу рабочай сілай з ліку колгаснікаў комсамольцаў, праз організацыю суботнікаў і г. д.

Таварышы комсамольцы! Забясьпечце хутчэйшае закончаньне будаўніцтва, вазьмеце на грамадзкі буксір адстаючых, пакажыце ўзоры ударнае працы, пакажэце як комсамол можа працаваць па-ўдарнаму і забясьпечваць перамогу.

Комсамольская організацыя Боркавіцкага ільнасаўгасу Дрысенскага р-ну.

Слухайце!

Наступнае слова ў спрэчках даем: сэкратару Гарадоцкага райкому КСМ тав. Грыцко і сэкратару ячэйкі Межанскага ільназаводу (у раёне будуюцца 3 заводы); сэкратару Вушацкага РК КСМ тав. Ліпаўка і сэкратару Вушацкай местачковай ячэйкі КСМ; сэкратару ячэйкі КСМ Бігосаўскага ільназаводу, Дрысенскага раёну.

Да адказнасьці за ігнораваньне

14-VIII на пасяджэньні сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ заслухалася пытаньне аб праверцы ходу будаўніцтва ільназаводаў на БССР з справаздачамі паасобных р-н комсамольскіх організацый.

Член праўленьня Бел'Ільнапенькасаюзу тав. Ярмовін своечасова быў запрошан для ўдзелу, але на пасяджэньне не зьявіўся.

Такія бюрократычныя, няўважлівыя адносіны да гэтага вельмі важнага пытаньня ёсьць ні што іншае як ігнораваньне комсамольскай організацыі, як шэфа будаўніцтва новых ільна-заводаў.

Мы просім адпаведныя партыйныя організацыі прыцягнуць да партыйнай адказнасьці тав. Ярмовіна.

Дырэктар тармозіць будаўніцтва

Згодна пляну, у Цэрахоўскім раёне к 1-га сьнежня павінен быць пабудаваны і пушчаны ў ход ільназавод. ...же, выключна па віне адміністрацыі, будаўніцтва заводу ідзе вельмі марудна. Замест патрэбных 45 рабочых на будаўніцтве працуе толькі 12. Дырэктар чамусьці прынцыпова адмаўляецца набіраць больш рабочых.

Ільназавод павінен быць скончаны ў тэрміну. Для гэтага трэба ўзмацніць тэмпы будаўніцтва.

В.

Соцыялістычнай жывёлагадоўлі ударныя тэмпы разьвіцьця

Конкрэтнымі справамі рэалізаваць адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР

Большасьць комсамольскіх раённых організацый ня ўключылася яшчэ ў месячнік ліквідацыі прарываў у жывёлагадоўлі, які праводзіцца з 15-га жніўня па 15-е верасьня. У некаторых раёнах і колгасах працаўнікі зьніжаюць наладжаняк і ігнараваць дырэктывы партыі і ўраду аб разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Комсамольскія організацыі павінны зараз-жа, не чакаючы ні хвіліны, кінуць усе сілы на популярызацыю, прапрацоўку і практычнае ажыцьцяўленьне апошняй адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК БССР аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Жлобінцы яшчэ не раскачаліся

Рэалізаваць адозву партыі і ўраду

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб жывёлагадоўлі ў Жлобіне яшчэ не распрацавана. Між тым, Жлобінскі раён зьяўляецца жывёлагадоўча-сьвінаводным. План організацыі малочных ферм выканана толькі на 40 проц., сьвінагадоўчых на 25 проц.

З 99 колгасаў раёну спэцыялізаваны маюць толькі 46, а із: 30 малочных і 16 сьвінаводных.


У малочна-жывёлагадоўчых колгасах налічваецца 1347 кароў, цялят замест 1000 галоўцы ўсяго 274.

Райколгассаюз не цікавіцца ўкомплектаваньнем гаспадарак лепшай жывёлай. Намесьнік старшыні Райколгассаюзу разважае:—„Не мая справа займацца сьвіньнямі".

Бюро РК ЛКСМБ не мобілізавала комсамольскія організацыі на актыўны ўдзел у спэцыялізацыі раёну.

Опортуністычнае недаацэньне спэцыялізацыі раёну і бязьдзейнасьць як комсамольскіх, так і ўсіх партыйных організацый павінна быць пабіта.

Рыг М.



За жывёлагадоўлю змагацца па-бальшавіцку

Тураўскі раён—жывёлагадоўчы. Але комсамольскія ячэйкі недаацанілі гэтага, не прыставілі ўсёй сваёй штодзённай работы да спэцыфічных умоў свайго раёну. Праўда, РК ЛКСМБ вынасіў прыгожыя пастановы, браў на сябе абавязацельствы, але практычна для палепшаньня справы жывёлагадоўлі нічога не зрабіў.

Тураўскі раён выканаў плян будаўніцтва сілосных установак толькі на 10 проц., сілосаваньня на 22,6 проц. Далей гэтага справа не рушылася. Забясьпечаньне жывёлагадоўлі кармовою базай не будзе цалкам вырашана.

Будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў для ферм зрываецца. Некаторыя колгасы адмаўляюцца браць сабе сьвінаматак.

У местачковым колгасе „Новае Жыцьцё" сьвінаводчая ферма на 96 сьвінаматак укомплектавана на 72 проц. Комсамольская ячэйка не цікавіцца, у якім становішчы сьвінарнік, а там цэлы рад недахопаў. Сьвіньні ляжаць у брудзе, кожны дзень—адзін падохлы. Работнікі сьвінарнікаў нядбайна адносяцца да сваёй працы, ніякай культурна-выхаваўчай работы сярод іх не праводзіцца.

Райком комсамолу пытаньнямі палепшаньня сьвінагадоўлі і жывёлагадоўлі ня цікавіцца. Комсамольская організацыя не змагаецца за разьвіцьцё соцыялістычнай жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі.

Бязьдзейнасьці і недаацэньні гэтых пытаньняў час паклясьці канец.

Міхась.

Штурмуючы прарыў у вайсковай рабоце, уключымся ва ўсесаюзную самаправерку

Пад знакам падрыхтоўкі да 17 МЮД'у і выкананьня рашэньняў зьездаў аб вайсковай рабоце правядзем самаправерку

Пастаўленая зьездамі задача аб вайсковай рабоце ў нас ганебна ня выконваецца.

Зараз уся організацыя ўключаецца ва ўсесаюзную самаправерку вайсковай работы. Мы таксама абавязаны ўключыцца ва ўсесаюзную самаправерку і гэтым узьняць вайсковую работу і выканаць рашэньні МЮД'у, ахапіць комсамольцаў вайсковай вучобай. Гэтая самаправерка перш за ўсё павіннаісьці па лініі ахопу ўсіх комсамольцаў спэцыяльна-вайсковай вучобай, стварэньня раду гурткоў па тэхніцы вайсковай справы да МЮД'у, праверкі соцумоў з падшэфнымі вайсковымі часткамі. Уся гэта праца праводзіцца пад знакам выкананьня пастаноў зьезду і баявых маршрутаў у вайсковай рабоце. Пад знакам падрыхтоўкі да XVII-га МЮД'у.

Мэтодам соцспаборніцтва і ўдарніцтва, рашучай барацьбою з опортуністычнай недаацэнкай вайсковай работы, разгортваньнем сапраўднай самаправеркі з адначасовай конкрэтнай работай па ўзмацненьню вайсковай вучобай, мы абавязаны дабіцца пералому.

Недаацанілі вайсковай справы

Комсамольская організацыя Случчыны ніякай працы не праводзіць па шэфству над паветраным флётам і лінкорам „Парыская комуна"

Збор сродкаў на зьвяно самалётаў імя ЛКСМБ і на падводную лодку праходзіць вельмі дрэнна, Шмат ячэек навет ня ведаюць аб гэтым бо райком комсамолу гэтай справай не кіраваў.

Разьвёрстка ЦК ЛКСМБ на пасылку ў авіяшколы ня выканана.

Бюро райкому КСМ хоць і абгаварваў гэта пытаньне, але не знайшоў часу праверыць. як ячэйкі выконваюць яго пастанову. Так, ячэйка праўшколы, атрымаўшы места у авія-школу, не паслала ніводнага з комсамольцаў, на што РК зусім не рэагаваў. Падрыхтоўчыя курсы у гэтыя школы не былі організаваны. Адозва IX зьезду УсеЛКСМ распрацавана не ва ўсіх ячэйках, а перад беспартыйнай рабочай моладзьдзю гэтае пытаньне і не ставілася.

В роўка Т. Р.

Наладзіць вайсковую работу

Вайсковая работа і шэфства над паветраным і морскім флётам у тураўскай раённай організацыі комсамолу пастаўлена слаба. Ніводзін вайсковы гурток ня існуе. Ніводная ячэйка нічога конкрэтнага не зрабіла яшчэ па пытаньню шэфства. Адозва ЦК УсеЛКСМ якбыццам прапрацавана на ўсіх ячэйках, але ні райком, ні ячэйкі ня здолелі гэтую адозву практычна ажыцьцявіць у раёне. Дадзеная разьвёрстка ў авіяшколы фактычна ня выканана, бо выдзеленыя таварышы, не падрыхтаваныя для паступленьня ў школу, ня вытрымалі іспытаў. Таксама слаба наладжана сувязь комсамольскай організацыі з падшэфным авіяатрадам. Соцумава, складзеная з падшэфнаю часткай, ня выконваецца. Падшэфная частка дала дошку з некаторымі разабранымі часткамі самалётаў, дошка не перадана ў ячэйкі, а валяецца ў райкоме.

Тураўскаму РК КСМ патрэбна прыняць адпаведныя захады, каб выканаць рашэньні зьездаў аб абавязковым вайсковым навучаньні.

Брыгадзір „Ч. З." Протчанка.

Аб шэфстве ня ведаюць

Усім вядома, што наш саюз шэфствуе над паветрана-морскім флётам, але, як гэта ні дзіўна, комсамольскі колектыў рымарнай фабрыкі (Менск) аб гэтым ня ведае. Вайсковая работа ў колектыве зусім адсутнічае, бюро колектыву па-опортуністычнаму адносіцца да гэтай справы. Сэкратар колектыву тлумачыць: „У нас няма спрыяючых умоў, каб праводзіць гэту работу". Аднак, прычына зрыву тлумачыцца тым, што значэньне вайсковай вучобы опортуністычна недаацэньваецца колектывам і асабліва яго сэкратаром. Трэба адкінуць такія разважаньні і к XVII МЮД'у дабіцца пералому ў вайсковай рабоце.

Брыгада „Ч. З." Карпучок і Фрыд.

З 15 жніўня—месячнік рэалізацыі адозвы

Слуцкі РК ЛКСМБ уключыўся ў месячнік па ліквідацыі прарываў на жывёлагадоўчым фронце, які праводзіцца з 15 жніўня.

Мобілізаваны комсамольцы, колгаснікі на рашучае ажыцьцяўленьне адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

З 15 па 25 жніўня па раёне праводзіцца дэкаднік штурму: капаньне сілосных ям і закладкі сілосу, каб забясьпечыць жывёлагадоўлю кармовою базай.

Сэкратар РК КСМ Фукісон

Рэалізуем адозву ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу

По сьлядох рэйду ўдарных брыгад „Чырвонай Зьмены“ і „Комсамольскай Праўды“

ЗА КОМСАМОЛЬСКІ МАГАЗЫН

Ударную брыгаду—на фронт перабудовы спажывецкай коопэрацыі

Трымайце раўненьне па комсамолii Менскага ЦРК!

Прыблізна паўтара месяцы назад, у нумары ад 26-га чэрвеня, „Чырвоная Зьмена“ зьмясьціла матар'ялы рэйду ударных брыгад „Чырвонай Зьмены“ і „Комсамольскай Праўды“ па пытаньнях рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу аб перабудове сыстэмы спажывецкай коопэрацыі.

Матар'ялы рэйду выявілі, што рад гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый зусім слаба рэалізуюць адозву, не надалі гэтай рабоце належных тэмпаў. Зьмешчаны ніжэй матар'ял сьведчыць аб тым, што гэтыя паўтара месяцы не далі належнага пералому ў рабоце, не зьвярнуў на яе неабходная ўвага.

Да 17 МЮД'у ЛКСМБ павінен дабіцца практычнага пералому ў рэалізацыі адозвы партыі і ўраду. Зачыненыя раней комсамольскія магазыны павінны быць зноў адчынены з тым, каб паказаць сапраўдныя ўзоры ўдарнай работы комсамолу ў барацьбе за карэнную перабудову ўсёй сыстэмы спажывецкай коопэрацыі.

У баку ад перабудовы

Ячэйка ЛКСМБ Белкоопсаюзу

зусім не займаецца гаспадарчымі пытаньнямі. Адозва партыі і ўраду, пастанова комсамольскіх арганізацый, матар'ялы рэйду комсамольскіх брыгад „Комсамольскай Праўды“ і „Чырвонай Зьмены“ ніякага адбітку ў працы колектыву не знайшлі. Далей прапрацоўкі адозвы колектыў не пайшоў, не перавёў яе на мову конкрэтных фактаў і дасягненьняў.

Да абвешчанага штурму па ліквідацыі прарыву комсамольцы ня былі падрыхтаваны, і ў выніку штурм ліквідацыі прарываў зьявіўся толькі шумнаю фразай.

Зараз кіраўніцтва комсамольскага колектыву зьменена. Новае бюро колектыву павінна дабіцца конкрэтнай рэалізацыі адозвы партыі і ўраду і забясьпечыць сапраўды ўдарную працу комсамольскага колектыву ў барацьбе за новы ўдарны коопэрацыйны апарат.

Брыгада „Ч. З.“ Н. Краўчанка, А. Фрыдман

Справа комсамольскай арганізацыі

ДРЫСА, 12. (Выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“). Рэйд ударнікаў „Чырвонай Зьмены“ праведзены выязною рэдакцыяй па пытаньню перабудовы спажывецкай коопэрацыі і палепшаньня грамадзкага харчаваньня, паказаў што Дрысенская спажыўкоопэрацыя не перабудавала свэёй працы адпаведна з пастановамі партыі і ўраду.

Плян севу прыгародных гаспадарак быў сарваны: засеяна толькі 10 проц. пляну. Продуктовыя крамы ў вельмі дрэнным стане. Усюды бруд і сьмецьце.

Райспажыўсаюз не клапоціцца аб правільным разьмеркаваньні продуктаў харчаваньня сярод насельніцтва раёну. Райспажыўсаюз і некаторыя Сельпо не адмовіліся ад фармальнай опортуністычнай працы ў галіне забясьпечаньня спажыўцоў. Аб гэтым сьведчыць з усёй яскравасьцю факт, што на галоўных вучастках работ, як дарожнае будаўніцтва, будоўля ільна заводаў, некалькі дзён ня было хлеба. Гэткіх прыкладаў багата.

Праца дрысенскіх коопэратараў не пастаўлена пад кантроль грамадзкасьці, грамадзкасьць не мобілізавана на барацьбу з гэтымі прарывамі.

Райком комсамолу павінен ажыцьцявіць сваё шэфства над комсамольскай сталоўкай.

Выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“—Казлоў, Канончык, Брыгада „ЧЗ“—Цыра, Конік, Муха, Касена.

Абвясьцім вайну чарзе

Колектыў ЛКСМБ МЦРК

Уключыўшы ў месячнік ліквідацыі чаргі. Абгаварыўшы гэта пытаньне на агульным сходзе, колектыў абвясьціў жнівень месяцам барацьбы з чаргою, за лепшую працу ўсіх магазынаў Цэрабкоопу.

Комсамольскі колектыў выклікаў на соцспаборніцтва колектыў ЛКСМБ Белкоопсаюзу. Для кіраўніцтва ўсёй гэтай работай вылучана пацёрка, якая павінна трымаць цесную сувязь са штабам праўленьня.

Згодна выпрацаванай праграме да кожнага магазыну прымацоўваюць аднаго комсамольца, які адказвае за стан барацьбы з чаргою.

Організуецца прыкладны комсамольскі магазын, які павінен выпрацаваць вопыт удзелу комсамолу ў рабоце магазынаў. Адначасова з гэтым організуюцца два магазыны, якія пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак і на зьдзельную аплату працы. Сіламі комсамольскіх колектываў організуюцца пяць павозак для гародніны.

Намечана ў бліжэйшы час перагледзець і прыстасаваць асобныя памяшканьні для прыёму папярэдніх заказаў.

Акрамя таго намечаны рад іншых мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць у бліжэйшы час карэнны пералом у справе ўдзелу комсамольскага колектыву МЦРК у рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу.

Сакратар колектыву Дзяюкевіч

На ўзровень новых задач

Наша арганізацыя пад кіраўніцтвам партыі бязупынна павышае сваю ролю ў соцыялістычным будаўніцтве. З часу IX зьезду ў нашу арганізацыю ўліліся новыя дзесяткі тысяч комсамольцаў. Зараз наша краіна становіцца перадавою ў галіне тэхнікі, навукі і ўжо стала краінай самага буйнога земляробства ў сьвеце, адсюль паўстае цэлы рад новых складаных задач. Каб практычна іх ажыцьцяўляць, комсамольская арганізацыя павінна падняць ідэолёгічную ўстойлівасьць сваіх членаў, кожны комсамолец у пасоўку— свой тэорэтычны ўзровень. Якое-ж становішча політвучобы ў нашай арганізацыі?

Бясспрэчна, мы маем ідэёва-політычны рост арганізацыі. Аб гэтым сьведчаць посьпехі, якіх дабілася наша арганізацыя на фронце сопбудаўніцтва. Мы маем узросшую цягу комсамольцаў да політвучобы.

Аднак, паміж цягаю к політвучобе і конкрэтнай работай камітэтаў і ячэек па арганізацыі сыстэматычнай вучобы комсамольцаў ёсьць разрыў. Асабліва дрэнна з політвучобаю вясковай комсамолі. Цэлы рад арганізацый не праводзіць паўсядзённую палітработу. Чаму? Па-першае, слаба перабудаваны формы і мэтады політвучобы. Цэх, зьвяно, брыгада не сталі, як правіла, апорным пунктам. Па-другое, ўвязвалася політвучоба з практыкай соцыялістычнага будаўніцтва, з выкананьнем прамфінпляну і ўдарнай уборкай, у выніку—яна губляла свой політычны сэнс. Дрэнна тут на нізе тое, што кіраўніцтва не разумее неабходнасьці ўвязаць політвучобу з выкананьнем гаспадарча-палітычных задач. Яшчэ больш шкодзіць, калі гэтыя „кіраўнікі“ глыбока ўпэўнены ў тым, што „інакш і быць не можа“. Па-трэцяе, няма належных прапагандысцкіх кадраў, якія змаглі-б па-сапраўднаму паставіць політвучобу на належную вышыню, … ўменьне, або проста нежаданьне выкарыстаць прапагандыстаў, якія ў нас ёсьць. Напрыклад, у Дрысенскім раёне з выпушчаных 25 чал. прапагандыстаў выкарыстана толькі нязначная частка. А галоўная прычына ў тым, што рад арганізацый опортуністычна недаацэньваюць політвучобу, пачасткі камітэты і кіраўнікі не ўмеюць … арганізацыйна кіраваць ёю. Адсюль і выходзіць, што рад арганізацый, асабліва вясковых, не правёў ніякай работы па выкананьню рашэньняў. Характэрна і неабходна падкрэсьліць, што … вучобы ў самым актыве нашай арганізацыі. Барацьбу за ўзьняцьцё тэорэтычнай вучобы трэба ў першую чаргу пачаць з бальшавіцкай арганізацыі сваёй вучобы.

Барацьбе за выкананьне політычна-гаспадарчых задач, прамфінпляну і пасьпяховай уборкі мы абавязаны падпарадкаваць усе формы і мэтады нашай работы, у тым ліку і політвучобу.

Асабліва важнае значэньне набывае політвучоба цяпер. Калі наша арганізацыя выконвае задачу перабудоўваньня комсамолу … Політвучоба зьяўляецца неабходнай умовай … выхаваньня навічкоў. На гэта задача павінна быць пераключана сетка політвучобы. Выхоўваць маладых комсамольцаў у ленінскім духу, выхаваць іх у барацьбе за генеральную лінію партыі і бальшавіцкую непрымірымасьць з рознымі адхіленьнямі ад лініі партыі—неадкладная задача комсамольскай арганізацыі.

Чым мы можам забясьпечыць зараз належнасьць політвучобы, што тут зьяўляецца рашаючым? Перш за ўсё, патрэбна ўзяцца за неадкладнае правядзеньне … і перабудаваць формы і мэтады політвучобы. Практычна:—перанесьці цэнтр вучобы ў брыгаду, у цэх, на поле. Па-другое, каб забясьпечыць пасьпяховую вучобу, трэба ўвязаць праходжаньне тэмы з практычнай работай. Напрыклад, гурток распрацаваў тэму аб індустрыялізацыі краіны. Тут можна прарабіць практычна наступнае: улічваючы недахоп рабочае сілы для будаўніцтва індустрыі, паставіць пытаньне ў колгаснай ячэйцы і дабіцца арганізацыі брыгады адыходнікаў з колгасьнікаў на будаўніцтва. Улічваючы важнасьць забясьпечаньня прамысловасьці сыравінаю, можна арганізаваць брыгаду па хуткаснай уборцы лёну, узяць шэфства і ўстанавіць кантроль за яго транспортаваньнем на пункт, і г. д. Пры такіх умовах вучоба будзе карысна і цікава. Па-трэцяе, патрэбна зараз прыступіць да падрыхтоўкі кадраў прапагандыстаў праз ранейшыя курсы, … і т. д.

Але як быць там, дзе зараз няма кіраўнікоў. Тады трэба на кароткі тэрмін пераключыцца на мэтад політчытак. Сутнасьць яго ў тым, што можна працаваць без кіраўніка. Адзін чытае, слухачы калектыўна разбіраюцца і запісваюць колектыўны адказ на пытаньне. Толькі пры гэтых умовах раённаму камітэту КСМ патрэбна забясьпечыць гэтыя гурткі консультантамі … для дапамогі ў разборы незразумелых пытаньняў. Па-чацьвертае, значна могуць і павінны дапамагаць у наладжаньні комсамольскай політвучобы партыйныя ячэйкі і асабліва партыйныя сакратары як мэтадычнай дапамогай, так і кіраўніцтвам у вучобе. Гарадзкія арганізацыі абавязаны дапамагаць у наладжаньні політвучобы вясковай комсамолі. Аднак, да гэтага часу ні партыйныя ячэйкі, ні гарадзкія арганізацыі амаль нічога не зрабілі ў гэтай галіне.

Непрымірымая барацьба з опортуністычнай недаацэнкай політвучобы, … у час уборкі, севу і г. д. Забясьпечыць … Політвучоба патрабуе адначасова і опэрацыйнага кіраўніцтва ўсіх зьвеньняў і асабліва райкомаў.

Вывучэньне рэволюцыйнай тэорыі, неадкладнае правядзеньне ў жыцьцё політмінімуму, увязка тэорыі з выкананьнем політычна-гаспадарчых задач, жывыя формы і мэтады вучобы—вось асноўныя задачы, якія забясьпечаць уздым політвучобы на ўзровень новых задач.

Г. Фіялкін.

Сёньня апошні дзень дэкады індустрыялізацыі!

Аднаасобны сэктар на буксір!

Шляхам разгортваньня організацыйна-масавай работы, пасылкай штурмавых брыгад забясьпечыць кожнага аднаасобніка пазыкай

Сёньня апошні дзень індустрыялізацыі. Сёньняшні дзень ня даў яшчэ перамогі ў рэалізацыі пазыкі 3-га рашаючага па вясковым сэктары, асабліва сярод сялян аднаасобнікаў. Камісіі садзейнічаньня і грамадзкасьць вясковых раёнаў не разгарнулі сярод аднаасобнікаў організацыйна-масавай работы па рэалізацыі пазыкі.

Неабходна па вопыту Жлобіна, паслаць штурмавыя комсамольскія брыгады ў адсталыя вёскі, дабіцца поўнага выкананьня пастановы ЦК УсеЛКСМ аб тым, што кожны комсамолец павінен завербаваць ня менш 6 падпішчыкаў.

Зводка падпіскі на пазыку „3-ці рашаючы“ па вясковым сэктары

Колгасьнікі	Аднаасобнікі	Усяго
122,9 проц.	12 проц.	45,3 проц.

„Прамень комуны“ прэміяваны


Колгас „Прамень комуны“ Слуцкага р-ну падпісаўся на пазыку трэцяга рашаючага году пяцігодкі на 5.300 рублёў. Падпіскай ахоплены ўсе колгасьнікі.

Перавыканалі плянавае заданьне Ўрэцкі і Сераднявоўскі сельсаветы.

Плянецца ў хвасьце Сэраскі сельсавет, які выканаў плян на 7,7 проц. і Ўсерскі—на 18 проц. Такія-ж сельсаветы, як Мусенкі, Палікарпаўскі, Шышчыцкі, Пецшакайскі, зусім не рэалізуюць пазыку.

Райкамсод пастанавіў прэміяваць колгас „Прамень кумуны“ за поўную рэалізацыю пазыкі ў колгасе. Брыгадзір „Ч. З.“ Я. Прыбытак.

Заносім на ганебны шчыт чарапахі



Выклікаем

Усе колгасьнікі колгасу імя Энгельса, Бабаўнянскага сельсавету, Капыльскага р-ну, падпісаліся на пазыку на 140 рабочых дзён і 90 р. наяўнымі грашыма. Аднаасобны сэктар—на 50.

Колгас выклікае пасьледваць прыклад колгасы імя Крупскай і „Ільліча“.

По даручэньню колгасу Красуцкі.

30 проц. павінны быць!

ПА ЖЫТКАЎСКІМ сельсавеце Барысаўскага р-ну рэалізацыя пазыкі трэцяга рашаючага выканана на 70 проц. плянавага заданьня. Сярод аднаасобнікаў пазыка рэалізавана на 2145 р., сярод колгасьнікаў—на 2755 р.

Цьвёрдыя кантрольныя лічбы па пазыцы трэцяга рашаючага якія даведзены да кулацкіх элемэнтаў, не спагнаны. Камісія садзейнічаньня не разгарнула організацыйна-масавай работы.

Трэба зараз-жа ўзяць бальшавіцкія тэмпы і рэалізаваць пазыку на 100 проц.

П. К.

Жлобін усё яшчэ адстае

Заданьне на падпіску трэцяга рашаючага вясковы сэктар жлобінскага р-ну выканаў толькі на 30 проц. Комсамольцы ня выконваюць пастанову ЦК УсеЛКСМ аб вярбоўцы кожным комсамольцам ня менш 6 падпішчыкаў.

Толькі зараз, калі прайшлі ўсе тэрміны, бюро РК ЛКСМБ пасылае ў адсталыя раёны штурмавыя брыгады для рэалізацыі пазыкі.

Рыг. М.

Падцягнуць адсталы вучастак

Пазыка 3-га рашаючага па Стара-Дарэскім р-не рэалізавана сярод рабочых і служачых на 66 тысяч рублёў, што складае 140 проц. заданьня.

Таксама разгорнута праца на колгасах: „Соцыялізм“ падпісаўся на 5300 р., „Рэс“—2170 р., „Комінтэрн“—750 р. і г. д.

Аднак, дрэнна праходзіць падпіска сярод новаорганізаваных колгасаў і ў аднаасобным сэктары. Тут комсамольскія ячэйкі ня цікавяцца працай па рэалізацыі пазыкі, а Стара-Дарэскі РК ЛКСМБ не мобілізаваў увагі гэтых ячэек на выкананьне важнейшай політычнай кампаніі.

Янка Палескі.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. … № 593